**Фёдараў, К.** Імя тваё не забыта, Ісакаў…/ К. Фёдараў // Дняпроўская праўда. — 2009. — 14 лют. — С. 2.

## ІМЯ ТВАЁ НЕ ЗАБЫТА, ІСАКАЎ…

**12 снежня 1979 года было прынята палітычнае рашэннне аб уводзе абмежаванага кантынгенту савецкіх войск у Афганістан. 25 снежня таго ж года савецкія войскі перайшлі дзяржаўную граніцу. І толькі 15 лютага 1989 года пакінулі тэрыторыю Афганістана. Страты асабовага саставу савецкіх войск за ўвесь час гэтай вайны склалі 14453 чалавекі. У іх ліку і ўраджэнец вёскі Каробкі Валякоўскага сельсавета Мікалай Іванавіч Ісакаў. Ён загінуў у красавіку 1984 года.**

…Нічым асаблівым не выдзяляецца магіла на сельскіх могілках. Колькі слёз выплакала тут былая цялятніца Кацярына Яўціхаўна – маці паўшага воіна, ведае толькі яна сама. Гараваў і бацька, Іван Макаравіч, які працаваў тады вадзіцелем. Ён пайшоў з жыцця дачасна, а Кацярына Яўціхаўна і цяпер прыязджае і прыходзіць на магілу сына. Сына-воіна, які загінуў геройскай смерцю. Што гэта так, засведчыў ордэн Чырвонай Зоркі, якім Мікалай Ісакаў узнагароджаны пасмяротна.

Ордэн застаўся, а зорка, жыцця Мікалая скацілася з небасхілу вельмі рана.

Мала пражыў і мала чаго пабачыў Мікалай. Рос у невялікай ціхай вёсцы. Пасля заканчэння васьмі класаў вучыўся ў Смаленску, атрымаў спецыяльнасць слесара-мантажніка. Праз два гады прызвалі на службу ў армію. Служыць пачынаў у Літве, потым быў Афганістан….

Бацькам пра сябе пісаў скупа і такімі ж скупымі былі звесткі аб яго гібелі.

Але не забылі пра воіна-інтэрнацыяналіста на яго малой радзіме. Яго імя, пэўна, ведаюць у кожнай школе, яно добра вядома ўсім воінам-інтэрнацыяналістам Дубровеншчыны. На яго магіле, у яго маці не раз бывалі прадстаўнікі раённага савета воінаў-інтэрнацыяналістаў, райваенкамата. Пра Кацярыну Яўціхаўну не забыліся і сёлета, калі ішла падрыхтоўка да 20-годдзя з часу вываду савецкіх войск з Афганістана. Імя Мікалая Ісакава прагучала ў дакладзе на ўрачыстым сходзе, прысвечаным гэтай падзеі. Пасля гэтага было сказана так: «Воіны-інтэрнацыяналісты – патрыёты, пераемнікі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, верныя высокім ідэалам, моцныя духам людзі – у ратнай і мірнай працы дэманстравалі і дэманструюць адданасць дабру і справядлівасці, прынцыповую жыццёвую пазіцыю».

Усё правільна, лепш не скажаш.

**К. Фёдараў**